академії УПЦ КП. — 2010. — № 1–4(16–19): Матеріали II Міжнародної наукової конференції "Християнська сакральна традиція: віра, духовність, мистецтво", Львів, 23–24 листопада 2010 р. — С. 145–156. Позірний "вишенський слід" у львівському п'ятницькому ансамблі — тільки найновіший приклад традиційного вже ігнорування визначального для перемишльсько-львівського регіону від періоду становлення нової мистецької культури XVII ст. львівського мистецького осередку й розвинутого на такому тлі захоплення провінційними явищами (за їх очевидного нерозуміння). Про львівських майстрів першої чверті століття див.: Його ж. Покоління творців львівської школи українського малярства XVII століття // Соціум. Альманах соціальної історії. — Київ, 2008. — Вип. 8. — С. 163–183. Давніший їх короткий перелік див.: Його ж. Іконостас… — С. 143–144. Про справжнє співвідношення львівського та вишенського осередків див.: Його ж. Джерела іконографії…

**SUMMARY**
**Volodymyr Alechandrovych**
**KIEV ICONOGRAPHY AT THE BEGINNING OF XVII CENTURY IN TRANSFERS OF THE BOOK`S ENGRAVINGS. FEATURES OF "HOLIDAY" CYCLE OF ANFOLOHION`S (1619) ILLUSTRATIONS**
The features of "holiday" cycle of ANFOLOHIONU (1619) illustrations was analyzed surch as an important transfer of Kiev religious iconography of the early XVII century. and features of its development. A conclusion of closer relationship of contemporary art with the traditions of Kiev previous day was made.
Key words: Kiev painting early of XVII century., Prints Anfolohionu in 1619, "holiday" cycle, Ukrainian religious iconography

***Галіна Флікоп***

# ІКАНАСТАСЫ Ў ГРЭКА-КАТАЛІЦКІХ ХРАМАХ УЛАДАЎСКАГА ДЭКАНАТУ Ў СЯРЭДЗІНЕ XVIII СТ.: ПАВОДЛЕ ВІЗІТЫ 1759 Г.

На основі архівних джерел XVIII ст. порушено питання формування сакральних інтер'єрів греко-католицьких храмів Влодавського деканату. В результаті дослідження переглянуто дані про наявність іконостасів і бічних вівтарів.
*Ключові слова: греко-католицький храм, іконостас, вівтар, архівні джерела, Влодавський греко-католицький деканат.*

Наяўнасць іканастасаў у грэка-каталіцкіх храмах разглядалася намі пры вывучэнні іншых дэканатаў (дэканат — царкоўная, тэрытарыяльна-

адміністрацыйная адзінка). Адзін з артыкулаў, які прысвечаны Брэсцкаму дэканату, выдадзены ў навуковым зборніку “Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі, фалькларыстыкі”[1]. Астатнія, дзе асвятляюцца пытанні іканапісу і сакральных інтэр’ераў (алтары, іканастасы) Пружанскага, Кобрынскага, Палескага (усе на Брэстчыне) і Базалійскага дэканатаў (Хмяльніцкая вобласць Украіны), — здадзены ў друк, але пакуль не апублікаваны. Такі падрабязны разгляд дадзенай тэматыкі ў шэрагу артыкулаў тлумачыцца тым, што ў другой палове XVIII ст. у грэка-каталіцкай Царкве адбываліся надзвачай цікавыя працэсы, якія паўплывалі на стан сакральнага мастацтва. Нават суседнія царкоўна-адміністрацыйныя адзінкі ў названы перыяд часам вельмі моцна розніліся між сабой паводле абсталявання храмавых інтэр’раў (гаворка ідзе пра наяўнасць/адсутнасць іканастасаў, бакавых алтароў), іканапісных выяў і інш. Больш за тое, фактычна на працягу ўсяго існавання Уніі адбываліся змены ў сакральных інтэр’ерах, і атрымаць уяўленне пра іх выгляд у той ці іншы прамежак часу дазваляюць падрабязныя пратаколы візітацый і інвентарызацый.

Пытанні размяшчэння абразоў у храме актуальныя менавіта ў вывучэнні ўніяцкай Царквы. Калі ў праваслаўным асноўная сакральная функцыя належала іканастасу, у каталіцкім — алтарам (галоўнаму і бакавым), дык для ўніяцкага — дадзенае пытанне з’яўляецца спрэчным і амаль неасветленым у навуковай літаратуры. Большасць даследчыкаў схільная лічыць, што грэка-каталіцкая Царква, як спадкаемца праваслаўя, на працягу XVII ст. іканастасы захоўвала, але ўжо з сярэдзіны XVIII ст. пачынаюць адбывацца працэсы лацінізацыі (як вынікі Замосценскага Сабору 1720 г.), што прывяло да скасавання іканастасаў і ўсталявання бакавых алтароў. На думку мастацтвазнаўца А. А. Ярашэвіча, які адзін з нешматлікіх навукоўцаў закранаў пытанні фарміравання грэка-каталіцкіх сакральных інтэр’ераў, недзе к сярэдзіне XVIII ст. іканастасы былі прыбраны з храмаў і паўсюдна ўжо былі ўладкаваны бакавыя алтары[2]. Існуюць і іншыя меркаванні на гэты конт, якія, праўда, не падмацаваны грунтоўным вывучэннем праблематыкі, а маюць “прапагандысцкі” характар. Гаворка ідзе пра працу Г. Я. Кіпрыяновіча, дзе аўтар — яўны прыхільнік праваслаўя — наконт іншых канфесій выказвае неабгрунтаваныя думкі: “Ещё задолго до Замойского Сабора (1720 г. — Ф. Г.) сняты были в большинстве униатских церквей иконостасы”[3].

Важнасць вывучэння дадзенага аспекту для мастацтвазнаўчага даследвання тлумачыцца тым, што наяўнасць або адсутнасць іканастасаў і бакавых алтароў уплывала на вобразны лад абразоў, тэхніку іх выканання, папулярнасць тых ці іншых сюжэтаў. Так, напрыклад, іканастасныя выявы ў большасці выпадкаў выконваліся на дрэве, а алтарныя — на палатне. У алтарах часцей за ўсё змяшчаліся іконы Маці Божай і разнастайных Святых (як правіла, ката-

**Табліца – Канструкцыя іканастасаў храмаў Уладаўскага дэканату (1759 г.)**

| населены пункт | тытул храма | ІКАНАСТАС | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | ЧЫН | | | БРАМЫ |
| | | кол-сць | назва | аснова абразоў | |
| Яблачна | Ануфрыя | 1 | мясцовы | - | Царская, Паўночная, Усходняя |
| Хана | Пятра і Паўла | 1 | мясцовы | - | Царская, Паўночная, Усходняя |
| Халешаў | Міхаіла Арханёла | 2 | мясцовы | - | Царская, Паўночная, Усходняя |
| | | | апостальскі | - | |
| Развадоўка | Міхаіла Арханёла | 3 | мясцовы | - | Царская |
| | | | святочны (?) | - | |
| | | | апостальскі | - | |
| Даўголіска | Апекі Маці Божай | 1 | мясцовы | - | Царская |
| Славатычы | Апекі Маці Божай | 3 | мясцовы | - | Царская |
| | | | апостальскі | - | |
| | | | 3-ці (?) | - | |
| Аполе | Мікалая | 2 | мясцовы | - | Царская |
| | | | апостальскі | - | |
| Галаўно | Дзмітрыя | 2 | мясцовы | - | Царская |
| | | | апостальскі | палатно | |
| Коданец | Нараджэння Маці Божай | 2 | мясцовы | - | Царская |
| | | | апостальскі | - | |
| Холя | Параскевы | 1 | мясцовы | - | Царская |
| Гарастыта | Узвядзення Крыжа | 2 | мясцовы | - | Царская |
| | | | апостальскі | дрэва | |
| Любень | Мікалая | 2 | мясцовы | - | Царская |
| | | | апостальскі | - | |
| Уладава | Нараджэння Маці Божай | 3 | мясцовы | - | Царская |
| | | | апостальскі | - | |
| | | | 3-ці (?) | - | |
| Харсы | Ператварэння | 1 | мясцовы | - | Царская |
| Даўгаброды | Узвядзення Крыжа | 1 | мясцовы | - | |
| Чэрск | Міхаіла Арханёла | 2 | мясцовы | - | Царская |
| | | | апостальскі | - | |
| Радзеж | Ператварэння | 2 | мясцовы | - | Царская, Паўночная, Усходняя |
| | | | апостальскі | дрэва | |
| Олтуш | Ператварэння | 1 | мясцовы | - | Царская, Паўночная, Усходняя |
| Арэхава | Параскевы | 2 | мясцовы | - | Царская |
| | | | апостальскі | - | |

*Канструкцыя іканастасаў храмаў Уладаўскага дэканату ( 1759 г.)*

ліцкіх), а ў іканастасе — традыцыйныя для яго сюжэты Маці Божай, Збавіцеля, Міколы, Архірэя, Апосталаў, часам Пророкаў і Божых Святаў.

Варта адзначыць, што зварот да візітаў (пратаколы візітацый) у навуковай літаратуры і даследчай працы не з’яўляецца новым. Апошнім часам назіраецца ўсё большая папулярнасць гэтага роду дакументаў. Дзякуючы разнастайнасці прадстаўленых у іх звестак, пратаколы візітацый выклікаюць цікавасць даследчыкаў, якія працуюць над рознымі пытаннямі грэка-каталіцкай Царквы. З беларускіх навукоўцаў да іх звярталіся гісторыкі С. Марозава[4], Дз.

Лісейчыкаў[5], кнігазнаўца Ю. Лаўрык[6]. Мастацтвазнаўцы таксама не абмінулі ўвагай гэты род дакументаў. Пры атрыбуцыі пэўных абразоў да пратаколаў візітацый звярталіся Н. Трыфанава[7], А. Ярашэвіч[8]. Між тым, коплексная апрацоўка звестак з іх пра іконы, а таксама пра наяўнасць/адсутнасць іканастасаў і бакавых алтароў дагэтуль не праводзілася.

Выкарыстанне гэтага віду архіўных крыніц для мастацтвазнаўчага даследавання тлумачыцца падрабязнасцю і каштоўнасцю прадстаўленых у іх звестак пра творы іканапісу. У названых дакументах прыводзяцца дадзеныя пра сюжэты абразоў; аснову, на якой яны створаны (дрэва, палатно, папера, метал, шкло); наяўнасць шаты, каронаў, вотаў, рамы; стан помніка (“ні на што не здатны”, “яшчэ добры” і інш.) і яго ўзрост (“стары”, “новы” і інш.); паходжанне (“італьянскі”, “маскоўскі”); месца размяшчэння ў храме (іканастас, алтар, менса, ахвярнік, сцены і інш.). Натуральна, што не пра кожны твор прыводзяцца ўсе гэтыя звесткі. Некаторыя характарыстыкі присутнічаюць рэдка (напрыклад, паходжанне адзначаецца толькі ў тых выпадках, калі абраз яўна не мясцовы). Тым не менш, пратаколы візітацый дазваляюць вызначыць найбольш распаўсюджаныя сюжэты на той ці іншы перыяд у пэўным рэгіёне, выявіць згадванні пра рэдкія выявы, якія, магчыма, і не захаваліся.

Дакумент “Wizyja generalna Pružańskiego, Kobryńskiego, Poliskiego, Kamieneckiego y Włodawskiego dyecezyi Brzeskiey dekanatów” (1759 г.), паводле якога праведзена даследаванне храмаў Уладаўскага дэканату, прадстаўляе сабой кнігу пратаколаў візітацый, складзеную на 450 старонках польскай мовай з лацінскімі і царкоўна-славянскімі ўстаўкамі[9]. Акрамя Уладаўскага ў ёй зафіксаваны звесткі пра Пружанскі, Камянецкі, Кобрынскі і Палескі дэканаты. Паводле крыніцы, у склад разглядаемай царкоўна-адміністрацыйнай адзінкі ў названым годзе ўваходзіў 21 храм. Пратакол кожнай царквы пачынаецца з назвы, запісанай большымі за астатні тэкст літарамі, у якую вынесены звесткі пра населены пункт, дзе ён знаходзіцца і, не заўсёды, тытул храма. Ніжэй пад назвай дублююцца гэтыя дадзеныя, а таксама пазначецца імя калятара і сцісла апісваецца царкоўны будынак. Далейшы пратакол складаецца з некалькіх раздзелаў, назвы якіх запісаны пасярэдзіне радка большымі літарамі.

Апісанне кожнага храма мае наступную структуру: агульныя звесткі пра царкву (тытул, месца знаходжання, матэрыял будавання, архітэктурная канструкцыя; раздзел пачынаецца са слова “cerkiew”[10] і назва царквы); сакраманты — раздзел “sanctissimum sacramentum”; алтар і абразы — “ołtarze y obrazy”; неабходныя для богаслужэння рэчы — “apparata y alby”; срэбра і волава — “srebro cyna”; царкоўныя кнігі — “xięgi cerkiewne”; могілкі — “cmętarz”; плябанія — “plebanja y pleban”; парафія і парафіяне — “parochia y parochianie”,



*Бакавыя алтары ў храмах Уладаўскага дэканату ў 1759 г.*

распараджэнні і заўвагі святару — “dekret reformationis”. Часам уводзіўся і дадатковы раздзел “dokumenta”, куды перапісваўся тэкст важных дакументаў пэўнай царквы (фундушы і г. д.), а таксама ў некаторых пратаколах прысутнічае раздзел “dochody cerkiewne” (царкоўны прыбытак).

Для даследавання іканапісу найбольш важнай часткай з’яўляецца “ołtarze y obrazy”, але карысные звесткі ёсць і ў раздзеле “srebro cyna”, дзе згадваліся металічные воты таго ці іншага абраза, абклады, кароны, а таксама апісваліся іконы, створаныя на бляшаных, медных або алавяных дошках. Як было адзначана вышэй, звесткі, прыведзеныя ў візіце, з’яўляюцца даволі падрабязнымі і дазваляюць скласці дастаткова грунтоўны малюнак пра выгляд храмавых інтэр’ераў і стан іканапісных помнікаў.

Цэнтрам Уладаўскага дэканату з’яўлялася мястэчка Уладава, якое зараз знаходзіцца на тэрыторыі Польшчы ля самай беларуска-польскай мяжы на поўдзень ад Брэста. На цяперашняй тэрыторыі Беларусі размешчаны толькі 5 населеных пунктаў, дзе некалі былі храмы Уладаўскага дэканату. Астатнія 16 уваходзяць ў склад Польшчы. Пры правядзенні даследавання тапонімы (у візітах — на польскай мове) былі ідэнтыфікаваны, і на карты нанесены назвы населеных пунктаў на беларускай мове згодна з сучаснымі




*Іканастасы ў храмах Уладаўскага дэканату ў 1759 г.*

даведнікамі.

У разглядаемы перыяд Уладаўскі дэканат межаваў з Палескім — на ўсходзе, Брэсцкім — на поўначы, Холмскім — на поўдні (па заходнім суседзе звесткі і пратаколы візітацый выявіць пакуль не ўдалося). У сучасных межах населеныя пункты Палескага дэканату знаходзяцца на тэрыторыі Беларусі, Брэсцкага — Беларусі і Польшчы, Холмскага — Украіны.

Як ужо адзначалася вышэй, даследчыкамі прынята лічыць, што ўжо ў сярэдзіне XVIII ст. іканастасы зніклі з уніяцкіх храмаў. Але візіты цэркваў Уладаўскага дэканату цалкам абвяргаюць гэтае меркаванне, пра што гаворка пойдзе ніжэй, а перад гэтым трэба колькі словаў сказаць пра асаблівасць апісання іканастасаў ў дадзенай крыніцы.

У дакументах у значэнні “іканастас” выкарыстоўваецца слова “deijsus” (дарэчы, не толькі ў названай візіце, а і ў пратаколах праверак іншых дэканатаў XVII — пачатку XIX ст.). Але не заўсёды, калі царква мела іканастас, пры яе апісанні выкарыстоўваўся дадзены тэрмін. Асабліва гэта датычыцца тых храмаў, дзе іканастасы мелі толькі адзін чын — мясцовы. Пра наяўнасць іканастаса ў такіх храмах можна меркаваць пры згадванні Царскай брамы (часам і дыяканскіх дзвярэй) і мясцовых абразоў, для якіх пры гэтым азначэнне “мясцовы” прыводзіцца не заўсёды. У апошнім выпадку сведчаннем таго, што гэта менавіта іканастасныя выявы мясцовага чыну, з’яўляецца ўпамінанне пра іх размяшчэнне адносна Царскай брамы

(справа і злева ад яе). Напрыклад, у візіце храма вёскі Даўголіска адзначаецца “Drzwi Carskie stare, bez rznęcia, malowane, wedle ktorych z jednej strony obraz Troycy S., w ramach, na mięsie szczupłey, po lewey — Nays. Panny, także na mięsie” (знакі прыпынку расстаўлены ў адпаведнасці з сучаснымі правіламі пунктуацыі, а напісанне словаў прыведзена ў адпаведнасці з дакументам. — Ф. Г.)[11].

У некаторых пратаколах пры адсутнасці тэрміна “deijsus” акрамя Царскай брамы згадваюцца “obraze namiesne” (мясцовыя абразы) з выкарыстанне менавіта прыведзенага словазлучэння. Гэта таксама дакладна сведчыць пра наяўнасць у храме іканастаса. Напрыклад, у візіце арэхаўскай царквы адзначаецца: “Namiestnych obrazow 3”. І далей у дакуменце яны пералічваюцца.

Варта сказаць пра выкарыстанне ў пратаколах яшчэ аднаго тэрміна, датычнага ніжняга чыну іканастаса — “ołtarze namiesne” (мясцовыя алтары)[12]. Выраз адлюстроўвае цікавую з’яву, якая мела месца выключна ў грэка-каталіцкіх храмах. Так бы мовіць, новы прынцып арганізацыі сакральнай прасторы, утвораны на спалучэнні праваслаўных і каталіцкіх традыцый. Мясцовыя алтары з’яўляюцца нічым іншым, як іканастаснымі абразамі ніжняга чыну з падстаўленымі да іх менсамі і/або пераабсталяванымі з дапамогай дадатковых рамаў, слупкоў і інш. у алтары. У літургічным плане яны выконвалі функцыю звычайных “класічных” бакавых алтароў. Цікава, што пры з’яўленні “ołtarzow namiesnych” захоўваліся і іканастасныя брамы.

Да нядаўняга часу гэтыя “канструкцыі” (“мясцовыя алтары” + іканастасныя брамы) выклікалі праблему ў індэнтыфікацыі. Паўставала пытанне, ці лічыць іх іканастасамі, ці не. У папярэдніх нашых артыкулах мы пазначалі гэта як “фрагменты” іканастаса з тлумачэннем таго, што ў іх склад уваходзіць. Пры гэтым трэба заўважыць, што складанасць паўставала менавіта з тымі канструкцыямі, якія некалі былі аднаяруснымі іканастасамі. Іканастасы ў некалькі чыноў у дакументах пры апісанні, як правіла, мелі тэрмін “deijsus”, які характарызаваў менавіта верхнія рады, а абразы ніжняга чыну, зноў-такі, былі названы “мясцовымі алтарамі”. Але непасрэднае згадванне ў дакуменце “deijsusa” дазваляла з дакладнасцю сцвярджаць пра яго наяўнасць у храме. Гэтага нельга было сказаць пра аднаярусныя іканастасы. Але ўсё ж наяўнасць Царскай брамы, а часам і дыяканскіх дзвярэй (Паўночная і Усходняя брамы) дазваляе назваць канструкцыю з “мясцовымі алтарамі” іканастасам. Гэта тлумачыцца праз літургічную функцыю брамаў, а значыць — і той канструкцыі з “мясцовымі алтарамі”, ў якую яны былі ўстаўлены.

Былі ў храмах яшчэ і „ołtarze poboczne”. Апошнія з’яўляюцца “звычайнымі” бакавымі алтарамі, традыцыя ўсталявання якіх у храме мае каталіцкія вытокі. Хаця, трэба падкрэсліць, Уладаўскі дэканат у гэтым плане адрозніваўся

ад суседніх: калі ў іншых царкоўна-адміністрацыйных адзінках Брэстчыны ў гэты час яны знаходзіліся амаль ва ўсіх цэрквах, дык у ім толькі 6 храмаў было з бакавымі алтарамі, а ва ўсіх астатніх іх функцыю выконвалі “o tarze namiesne”, у трох цэрквах не было ні тых, ні іншых[13].

Што датычыцца іканастасаў, то іх было даволі шмат — 19. Гэта складае 90,5% ад усіх цэркваў дэканату (у “суседзеў” — недзе каля 60%). Толькі ў двух храмах — ражанскім і матвіцкім — іканастасаў не было[14]. Гэтыя лічбы красамоўна сведчаць пра тое, што даследчыкамі была яўна перабольшана лацінізацыя ўніяцкай царквы, якая адбывалася пасля Замосценскага Сабору. Больш за тое, у гэты час не толькі захоўваліся старыя іканастасы ранейшых часоў, а нават усталёўваліся новыя. Гэта датычыцца Мікалаеўскага храма ў в. Аполе, дзе “deisus jeszcze nie wystawiony, na ktory już są przygotowane Drzwi Carskie z bramką, obraz Archiereia y obrazy SS. Apostołow z ramami y innemi akkomodacyami”[15]. Усталёўваліся ў храмах і новыя брамы. У царкве в. Яблачна пра дыяканскія дзверы адзначана, што яны яшчэ не фарбаваныя[16]. Хаця, трэба падкрэсліць, у 7 выпадках Царская брама згадваецца як старая.

Адносна іканастасаў варта прывесці яшчэ адныя лічбы. Напярэдадні скасавання Уніі вялося пераабсталяванне грэка-каталіцкіх цэркваў з тым, каб іх далучыць да праваслаўя. З гэтай нагоды ўсталёўваліся іканастасы там, дзе іх не было, знішчаліся бакавыя алтары, арганы і г.д. У 1837 г. (да якога гэтыя змены ў сакральных інтэр’ерах праз руплівасць святароў меліся завершыцца) быў складзены зводны дакумент у выглядзе табліц, у якім сістэматызаваны звесткі пра 26 дэканатаў (на той час перайменаваны ў пратапопіі). Уладаўскі дэканат, у такім выглядзе, як ён апісаны ў візіце 1759 г., ужо не існаваў. Гэта адбылося ў сувязі з палітычнымі падзеямі і тэрытарыяльнымі пераўтварэннямі — падзеламі Рэчы Паспалітай. У склад якога дэканату ўвайшлі 16 храмаў па левы бок ад мяжы — не вядома. А вось 5 цэркваў — у вёсках Харсы, Чэрск, Радзеж, Олтуш, Арэхава — апынуліся ў Палескай пратапопіі (цэнтрам якой, верагодна, была Маларыта). Звесткі пра храмы прадстаўлены ў табліцах. Графа “Іканастас” дзеліцца на тры слупкі: “находился издревле”, “построен в последние годы”, “ещё не имеется”. У адпаведным слупку для кожнай царквы рабілася пазначэнне. Які перыяд часу маецца на ўвазе пад словам “издревле” — не вядома. Тым не менш, ва ўсіх пяці храмах, якія раней уваходзілі ў склад Уладаўскага дэканату, адзначана менавіта “находился издревле”[17]. Трэба падкрэсліць, што і ў 1759 г. у гэтых цэрквах існавалі іканастасы. Гэта дазваляе выказаць меркаванне, што яны і не знікалі ў названых храмах на працягу ўсяго перыяду Уніі.

Кажучы пра іканастасы, нельга абмінуць увагай і такое пытанне, як іх канструкцыя. У мастацтвазнаўчай літаратуры гэты аспект амаль



*Фрагмент старонкі дакумента “Ведомость о устройстве церквей” 1837 г.*

не разглядаўся. Спецыяльных даследаванняў, прысвечаных іканастасу, няма. Між тым слушныя назіранні ўсё ж былі зроблены. Гэта датычыцца меркавання Ю. В. Хадыкі, які адзначыў, што беларускія іканастасы перыяду Уніі замест дэісуснага мелі апостальскі чын[18]. А А. А. Ярашэвіч падкрэсліў, што асаблівасцю беларускага іканастаса з'яўляецца яго кантрукцыя ў 3-4 чыны[19].

Візітацыйныя акты сапраўды пацвярджаюць наяўнасць апостальскага чына. Ён меўся ва ўсіх двух— і больш -ярусных іканастасах. У дакументах, як правіла, зроблены наступны запіс “w gorze jest obraz Archiereia... obrazy SS. Apostołow”[20]. Такое месца размяшчэння адзначана ў візітах большасці храмаў Уладаўскага дэканату. Для некаторых цэркваў увогуле не пазначана, дзе знаходзіліся абразы з названымі выявамі. Але іх размяшчэнне зразумела з кантэксту дакументаў. Толькі пры апісанні чэрскай царквы ўпамінаецца другі чын: “w drugiey kondygnacyi obraz Archiereia z obrazami Apostołow”[21]. Хаця, трэба адзначыць, у візітах храмаў іншых дэканатаў выраз “w drugiey kondygnacyi” выкарыстоўваецца значна часцей.

Праўда колькасць абразоў у апостальскім радзе не адзначана ні ўводным пратаколе. Не вядома, ці ўсе 12 Апосталаў тут былі прадстаўлены, ці толькі некаторыя з іх. Найбольшыя складанасці тут выклікае канструкцыя арэхаўскага іканастаса. Над Царскай брамай там знаходзілася выява Архірэя, а абразы Апосталаў, якія павінны былі змяшчацца абапал яе, не згадваюцца. Можна меркаваць, што гэта быў аднаярусны іканастас (абразы мясцовага чыну апісваюцца), і ў ім, як у іншых такога роду канструкцыях, над брамай знаходзілася ікона. Толькі ў астатніх храмах у дадзеным выпадку гаворка ідзе пра “Тайную вячэру” або выяву “Спас нерукатворны”, якія кананічна (адна з іх) і займалі адпаведнае месца. Тут жа яны не

ўпамінаюцца. Таму можна лічыць арэхаўскі іканастас аднаярусным, дзе замест “традыцыйнай” іконы над Царскай брамай быў змешчаны “Архірэй”. Аднак небеспадстаўным будзе меркаванне, што названая канструкцыя — двух’ярусны іканастас, у якім другі чын прадстаўлены толькі адной іконай. Такія выпадкі вядомы ў іншых храмах. Так, захаваны іканастас канца XVIII — пачатку XIX стст. у давыд-гарадоцкай Юраўскай царкве ў праайцоўскім чыне мае толькі адну выяву — Саваофа[22].

Не зразумела таксама, колькі чыноў меў новы апольскі іканастас, пра які гаворка ўжо ішла вышэй. Па ўсёй верагоднасці, ён таксама быў двух’ярусны, бо адзначана, што ўжо падрыхтаваны абразы Архірэя і Апосталаў. Пра мясцовы чын нічога не гаворыцца, але само сабой зразумела, што ён быў. Толькі не вядома, ці былі створаны для яго новыя абразы. Магчыма быў прадугледжаны і яшчэ які-небудзь верхні чын. Але, усё ж, гэта мала верагодна, бо са звестак у дакуменце складаецца ўражанне, што іканастас з “Апосталамі” і Царскай брамай ужо цалкам падрыхтаваны, але яшчэ не ўсталяваны.

Такім чынам, калі арэхаўскі і апольскі іканастасы лічыць двух’яруснымі, дык колькасць апошніх сярод іншага тыпу канструкцый найбольшая — 9 (з 19 храмаў з іканастасамі). У сямі цэрквах былі іканастасы ў адзін чын. І толькі тры мелі трох’ярусныя[23]. Але, якія там былі чыны акрамя мясцовага і апостальскага, не вядома. У Развадоўцы “w drugiey kondygnacyi DEJSUSU obrazow rożnych 15. W gorze obraz Archiiereia z obrazami SS. Apostołow”[24]. Па ўсёй верагоднасці, другі чын быў святочны. Пра гэта сведчыць, па-першае, тое, што ён размяшчаўся ніжэй за апостальскі, а па-другое, у іншым выпадку было б адзначана, што гэта — выявы Прарокаў або Святых.

Менавіта гэта і гаворыцца ў візіце славатыцкага храма: “w samym wierzchu Weronika z pobocznemi rożnych SS. obrazami”[25] (“Weronika” — “Спас нерукатворны”). Гэта мог быць прарочы або прайцоўскі чын, бо ён размешчаны над апостальскім. Але паколькі дакладна не гаворыцца пра выявы прарокаў (як у іншых выпадках), то тут, па ўсёй верагоднасці, знаходзіліся розныя абразы. Магчыма, гэта быў “змяшаны” рад, што было натуральнай з’явай для беларускага тагачаснага іканастаса: іконы і прарокаў, і праайцоў.

Тое ж датычыцца і уладаўскага храма, дзе “powyżey ktorych (“Апосталаў”. — Ф. Г.) obrazow większych 4”[26]. Відавочна, што абразоў, размешчаных вышэй за апостальскі чын, было больш за 4, бо такая колькасць адзначана, як “большыя”, што сведчыць пра наяўнасць і “меншых”. Колькі іх было і якога зместу — не вядома.

Трэба яшчэ раз падкрэсліць, што ў візітах няма дакладных звестак пра рады трох’ярусных іканастасаў. Які чын там знаходзіўся акрамя мясцовага

і апостальскага — не вядома.

Кажучы пра канструкцыю іканастаса нельга абмінуць увагай такое пытанне, як наяўнасць брамаў. Безумоўна, у кожным іканастасе знаходзілася Царская брама, як неад’емная яго частка. А вось дыяканскія дзверы былі не ўсюды. Ва ўсялякім разе, яны згадваюцца не ва ўсіх візітах. Толькі ў пяці храмах акрамя Царскай знаходзіліся Паўночная і Усходняя брамы[27].

Што датычыцца іх выгляду, то ў большасці выпадкаў Царскія дзверы былі разьбяныя. Хаця не заўсёды. Так, у в. Даўголіска знаходзілася старая брама без разьбы[28]. У арэхаўскім і чэрскім храмах — з разьбой толькі ўверсе. А коданецкая Царская брама мела і разьбяныя выявы Дабравесця і Евангелістаў. У некалькіх выпадках, як правіла для старых дзвярэй, наконт разьбы звестак няма. Тое ж датычыцца і дыяканскіх.

Для шасці Царскіх брамаў адзначана наяўнасць жывапісных выяў. У трох выпадках — храмы ў вёсках Олтуш, Радзеж, Хана — гэта сюжэт Дабравесце і чатыры Евангелісты. У іншых трох — уладаўская, холеўская, славатыцкая цэрквы — толькі Евангелісты. Выявы на дыяканскіх дзвярах у візітах Уладаўскага дэканату не згадваюцца.

І апошні аспект, на якім варта засяродзіць увагу — абразы над Царская брамай. Як адзначалі даследчыкі, менавіта гэтыя іконы разам з апостальскім чынам утваралі “крыжовы кампазіцыйны стрыжань” і неслі асноўную дэкаратыўную і сэнсавую нагрузку[29]. Паводле канонаў праваслаўнай царквы над Царскай брамай мусіў знаходзіцца абраз “Тайная вячэра” або “Спас нерукатворны”. У храмах Уладаўскага дэканату сустракаюцца абедзьве выявы. “Тайная вячэра” знаходзілася ў іканастасах вёсак Хана, Славатычы, Холя, Уладава, Чэрск. “Спас нерукатворны” — у Галаўно, Любень, Олтуш. У даўголіскім іканастасе была змешчана выява Збавіцеля. У некалькіх аднаярусных іканастасах над Царскай брамай абразоў не было. А ў астатніх — там была змешчана выява Архірэя, якая з’яўлялася цэнтрам апостальскага чыну. Дарэчы, у іканастасах пералічаных вышэй вёсак над “Тайнай вячэрай” або “Спасам нерукатворным” таксама змяшчаўся “Архірэй”, калі іканастас быў не аднаярусны.

Такім чынам, вывучэнне архіўных крыніц паказала, што ва Уладаўскім дэканаце ў 1759 г. іканастасы захоўваліся ў 90% храмаў. Гэта надзвычай вялікая лічба. Але, трэба падкрэсліць, што Уладаўскі дэканат не з’яўляецца агульным паказчыкам, бо ў іншых царкоўна-адміністрацыйных адзінках, з дакументамі якіх мы мелі магчымасць працаваць, сітуацыя адрознівалася. У дэканатах Брэстчыны было недзе каля 60% храмаў з іканастасамі, а на Гродзеншчыне ў разы менш — каля 10%. Патлумачыць на дадзены момант гэтую з’яву складана. Для гэтага неабходна апрацаваць візіты іншых дэканатаў, якія прадстаўляюць усе рэгіёны Беларусі. Магчыма тады

будуць бачныя пэўныя заканамернасці. Але нават зараз можна сказаць, што сітуацыя ў храмах Уладаўскага дэканату усё ж супярэчыць з меркаваннем даследчыкаў пра істостную лацінізацыю уніяцкай Царквы пасля Замосценскага Сабору. Больш за тое, гэтыя лічбы (90% храмаў з іканастасамі) выглядаюць незразумелымі, калі ўзяць у разлік той факт, што разглядаемая царкоўная адзінка з'яўляецца самай "заходняй", і каталіцкія ўплывы тут маглі быць найбольшымі.

Што датычыцца выгляду іканастасаў, то тут яны збольшага былі адна— і двух'яруснымі, што таксама не адпавядае "класічнай" канструкцыі беларускага іканастаса, які, паводле А. А. Ярашэвіча, быў, як правіла, у тры ці чатыры рады. Затое тут выразна прасочваецца іншая характэрная рыса беларускага іканастаса — наяўнасць апостальскага чыну (замест дэісуснага).

---

1 Флікоп Г. А. Творы іканапісу ва ўніяцкіх храмах Брэсцкага дэканату 2-й паловы XVIII ст.: на матэрыялу пратаколаў візітацый / Г. А. Флікоп // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі. Вып. 11 / Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАН Беларусі ; навук. рэд. А. І. Лакотка. — Мн. : Права і эканоміка, 2011. — С. 590–602.

2 Ярашэвіч А. А. Іканастас / А. А. Ярашэвіч // Рэлігія і царква на Беларусі : Энцыкл. давед. / рэдкал. : Г. П. Пашкоў і інш. ; маст. А. А. Глекаў. — Мн. : БелЭн, 2001. — С. 125–126: іл.

3 Киприанович Г. Я. Исторический очерк православия, католичества и унии в Белоруссии и Литве / Г. Я. Киприанович. — Мн. : издательство Белорусского Экзархата, 2006. — С. 170.

4 Марозава С. В. Уніяцкая царква ў этнакультурным развіцці Беларусі (1596–1839) / С. В. Марозава ; пад. навук. рэд. У. М. Конана. — Гродна: ГрДУ, 2001. — 352 с.

5 Лісейчыкаў Д. В. Штодзеннае жыцце уніяцкага парафіяльнага святарства беларуска-літоўскіх зямель (1720–1839 гг.) : дысертацыя на суісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук / Дзяніс Васільевіч Лісейчыкаў ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. — Мінск : [б. в.], 2008. — 283 с. : іл., табл.

6 Лаўрык Ю. Кніжныя зборы пры грэка-каталіцкіх святынях / Ю. Лаўрык // Часопіс "Наша вера" : [электронны рэсурс]. — 2008. — № 3 (45). — Рэжым доступу : http://media.catholic.by/nv/n45/art13.htm. — Дата доступу 13.05.2010.

7 Трыфанавана Н. Я. Выбраныя Святыя / Н. Я. Трыфанава // Алтарны жывапіс Беларусі XVIII — XIX стагоддзяў [электронны рэсурс] : віртуальная версія выставы "Алтарны жывапіс Беларусі XVIII — XIX стагоддзяў" у Нацыянальным мастацкім музеі 23 лютага — 10 чэрвеня 2009 г. — Мінск : Нацыянальны мастацкі музей, 2009. — 1 электрон. апт. дыск (CD-ROM).

8 Ярашэвіч А. А. Уступ / А. А. Ярашэвіч // Алтарны жывапіс Беларусі XVIII–XIX стагоддзяў : [электронны рэсурс] : віртуальная версія выставы "Алтарны жывапіс Беларусі XVIII–XIX стагоддзяў" : у Нацыянальным мастацкім музеі 23 лютага — 10 чэрвеня 2009 г. — Мінск : Нацыянальны мастацкі музей, 2009. — 1 электрон. апт. дыск (CD–ROM).

9 Дзяржаўны гістарычны архіў Літвы (далей — ДГАЛ). — Ф. 634. — Воп. 1. — Спр. 48. — Wizyja generalna Prużańskiego, Kobryńskiego, Poliskiego, Kamieneckiego y

Włodawskiego dyecezyi Brzeskiey dekanatów. — 1759. — 450 с.
10 Тут і далей захавана напісанне польскіх словаў у адпаведнасці з гістарычнымі дакументамі.
11 Там сама. — С. 378.
12 У нашым артыкуле, прысвечаным Брэсцкаму дэканату, намі было памылкова адзначана, што выкарыстанне такога выразу — асаблівасць дакумента “Wizyja dekanatu Brzeskiego” 1773 г. Як бачна з прыведзеных вышэй звестак, у іншых пратаколах такі тэрмін таксама выкарыстоўваўся.
13 Гл. малюнак 1.
14 Гл. малюнак 2.
15 ДГАЛ. — Ф. 634. — Воп. 1. — Спр. 48. — С. 386.
16 Там сама. — С. 357.
17 ДГАЛ. — Ф. 634. — Воп. 1. — Спр. 4. — Ведомости о устройстве церквей. — 1837 г. — Арк. [20] адг. Гл. малюнак 3.
18 Хадыка А. Ю., Хадыка Ю. В. Рэнесанс у беларускім новым іканапісе / А. Ю. Хадыка, Ю. В. Хадыка // Помнікі мастацкай культуры Беларусі эпохі Адраджэння / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; рэд. С. В. Марцэлеў. — Мінск : Навука і тэхніка, 1994. — С. 69.
19 Ярашэвіч А. А. Іканастас. — С. 126.
20 ДГАЛ. — Ф. 634. — Воп. 1. — Спр. 48. — С. 367.
21 Там сама. — С. 428.
22 Іканапіс Беларусі XV–XVIII стагоддзяў / Аўтар тэксту і складальнік Н. Ф. Высоцкая. — Мн. : Беларусь, 2001. — № 76.
23 Гл. табліцу.
24 ДГАЛ. — Ф. 634. — Воп. 1. — Спр. 48. — С. 375.
25 Там сама. — С. 382.
26 Там сама. — С. 411.
27 Гл. табліцу.
28 ДГАЛ. — Ф. 634. — Воп. 1. — Спр. 48. — С. 378.
29 Ярашэвіч А. А. Іканастас. С. 126.

## SUMMARY

**Halina Flikop**

**ICONOSTASES IN THE GRECO–CATHOLIC TEMPLES OF THE VLODAVA TERRITORIAL CHURCH–ADMINISTRATIVE UNIT AT THE MIDDLE OF THE 18TH CENTURY: ON THE BASIS OF ARCHIVAL SOURCES OT THE 1759.**

In given article the questions of formation of sacral interiors of Greco–catholic temples of the Vlodava territorial church–administrative unit is considered on the basis of archival sources of the 18th century. As a result of research the data about presence of iconostases and lateral altars is reconsidered.
Keywords: greco–catholic temple, iconostasis, altar, arcival sources, the Vlodava Greco–catholic territorial church–administrative unit.